
ПАМЯЦЬ
НАШАЙ
ЗЯМЛІ
5

ХТО
Ў ПЕРАМОЖЦАХ
КОНКУРСУ?
13



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

+TV ПРАГРАМА

20 СТУДЗЕНЯ 2023 г. ПЯТНІЦА № 12 (29892)

КОРАТКА

• Навукаёмістая і высокатэхналагічная прадукцыя складае больш за трэць беларускага экспарту.

• Дзінара Алімбекава-Смольская заняла 4-е месца ў спрынце на этапе Кубка Садружнасці.

• У краіне будзе паскорана развіццё станкабудавання.

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Сяргей ШЛЫЧКОЎ, старшыня Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях:**

*«З 2012 года колькасць тэхнапаркаў у краіне павялічылася з 11 да 17. Гэта сведчыць аб тым, што паслугі па падтрымцы інавацыйнага прадпрымальніцтва становяцца ўсё больш запатрабаванымі. Цяпер плануем прывесці работу тэхнапаркаў у адпаведнасць з перспектыўнай мадэллю, распрацаванай ДКНТ. Што ўяўляе з сябе гэтая мадэль? Тэхнапарк аказвае падтрымку рэзідэнтам шляхам матэрыяльна-тэхнічнага, фінансавага, арганізацыйна-метадычнага, інфармацыйнага, кансультацыйнага і іншага забеспячэння. А таксама садзейнічае стварэнню і развіццю суб'ектаў малога бізнесу ў сферы інавацый, каб яны ў далейшым таксама сталі рэзідэнтамі. Але на гэтым мы не спынімся. У краіне плануецца і надалей ствараць новыя тэхнапаркі і іх філіялы ў рэгіёнах. Тэхнапаркі, у сваю чаргу, павінны развіваць тэхналагічную інфраструктуру для аказання паслуг рэзідэнтам, прыцягваць пазабюджэтныя крыніцы фінансавання для суб'ектаў інавацыйнай інфраструктуры і для забеспячэння сваёй работы».*

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «Мы адназначна выстаім»

**Ад узаемнага гандлю да супрацоўніцтва ў знешнепалітычнай сферы — такія тэмы абмеркавалі Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка і міністр замежных спраў Расіі Сяргей Лаўроў падчас рабочай сустрэчы. Кіраўнік расійскага МЗС 18—19 студзеня знаходзіўся ў Беларусі з рабочым візітам. Нагодай для яго стала пасяджэнне сумесных калегій міністэрстваў замежных спраў Беларусі і Расіі, якое традыцыйна праходзіць кожны год, каб зверыць гадзіннікі і абмеркаваць актуальныя тэмы двухбаковага супрацоўніцтва ў знешнепалітычнай дзейнасці.**


Фота БелТА.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што пытанні, якія яму трэба абмеркаваць з Сяргеем Лаўровым, не абмяжоўваюцца пытаннямі, вынесенымі на парадак дня пасяджэння калегій двух міністэрстваў. «Вы ведаеце маё стаўленне да вас, я ніколі нічога не хаваю ад вас. Гэта вельмі важна», — адзначыў ён. Некаторыя актуальныя пытанні Аляксандр Лукашэнка і Сяргей Лаўроў абмеркавалі тэт-а-тэт. Як адзначыў кіраўнік дзяржавы, гэта абсалютна не значыць, што нешта хаваецца, проста некаторыя пытанні знаходзяцца па-за рамкамі афіцыйных мерапрыемстваў.

«Мы год закончылі. У курсе — прытым вельмі добра азнаёмлены — вынікаў года ў Расіі. Прыкладна такія ж вынікі года і ў нас. Вельмі добра, што мы ў гандлёва-эканамічных адносінах з Расійскай Федэрацыяй выйшлі на баланс гандлю. Нават крыху вышэйшае сальда на карысць Беларусі. Гэта сведчыць аб тым, што тыя спробы задушыць Расію і Беларусь фактычна праваліліся. Мы адназначна выстаім», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Па яго словах, у мінулым, 2022-м, цяжкім годзе краіны вызначылі кірункі, па якіх павінны рухацца, каб ва ўсіх адносінах захаваць свой суверэнітэт.

«Вельмі актыўна рухаемся наперад у эканоміцы па імпартазамяшчэнні. Мы з Прэзідэнтам Пуціным пачынаем з гэтага практычна любую сустрэчу. Эканоміка — падмурак, калі будзе ўсё нармальна ў нас у эканоміцы, астатнія пытанні мы вырашым», — сказаў беларускі лідар.

Датычна адносін міністэрстваў замежных спраў Беларусі і Расіі Прэзідэнт падкрэсліў, што ўжо даўно лічыць іх узорнымі. Ён заўважыў, што калі б усе ведамствы так супрацоўнічалі, як МЗС, то не было б ніякіх праблемных пытанняў.

Аляксандр Лукашэнка звярнуўся да тэмы спецыяльнай ваеннай аперацыі, якую Расійская Федэрацыя праводзіць ва Украіне. «Усё, што я абяцаў, усё, што трэба для Расіі (для нас — для Расіі і Беларусі) у гэты няпросты перыяд, мы робім. Слухаў вашу прэс-канферэнцыю (прэс-канферэнцыя Сяргея Лаўрова па выніках дзейнасці расійскай дыпламатыі ў 2022 годзе — 18.01.2023. — **«Зв.»**), вашы заявы напярэдадні. Абсалютна іх падтрымліваю. І пры любых кантактах, якія ў нас здараюцца з Захадам ці з іншымі, мы заўсёды кажам, што Расія ніколі не была супраць міру. Калі ласка, давайце будзем дамаўляцца, мы гатовы ў гэтым удзельнічаць. Вы ў гэтым, Сяргей Віктаравіч, не павінны сумнявацца. Калі нешта трэба, мы з нашага боку нешта можам і павінны зрабіць (вы добра ведаеце, што мы можам зрабіць), скажыце прама, мы будзем працаваць разам рука ў руку», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт падкрэсліў, што сёння бяспека для Беларусі, не толькі для Расіі — яшчэ больш важная, чым была раней. Па яго словах, сёння Захад спрабуе выкарыстаць Украіну супраць Беларусі. «Але, што мяне ўражвае і прыемна здзіўляе, — Украіна пакуль трымаецца, яна на правакацыі супраць Беларусі не ідзе. Хоць яе актыўна падштурхоўваюць нашы заходнія суседзі. Даводзіцца вытрымаць гэты час. Але тое, што мы вытрымаем, мінулы 2022-і паказаў. Тут мы з вамі аднолькавай пазіцыі прытрымліваемся. Словам, ёсць аб чым пагаварыць», — рэзюмаваў кіраўнік дзяржавы.

СТАР. 2

Свая справа

# ЦЕПЛЫНЯ... ЯНА ПРАДАЕЦЦА



**Майстрыха ведае, як старыя парваныя рэчы выкарыстаць для творчасці, і не можа прайсці міма даўгашэрснага сабакі. Імкненне атрымліваць заробак ад хобі і дзяржаўны клопат дапамаглі шматдзетнай маці з Гомельскага раёна змяніць сваё жыццё.**

## «Вяжу, колькі сябе памятаю»

У доме Фрошыных з пасёлка Чонкі пад Гомелем усе ведаюць, што гаспадыня, любімая жонка, маці трох сыноў умее ствараць незвычайную музыку. У яе руках шумяць, цокаюць, б'юць рытм кросны і калаўрот. Ганна з ніткамі, кручком і пражай, колькі сябе памятае — вязаць навучылася, калі ў школу яшчэ не хадзіла. Не так даўно жанчына асвоіла ткацтва.

— Па спецыяльнасці я закройшчыца, — расказвае Ганна. — Калі пайшла ў трэці дэкрэтны водпуск (сыну цяпер пяць гадкоў), загарэлася ідэяй вырабляць пражу з шэрсці сабак і воўны. Даведалася, што ў Расіі робяць ніткі з шэрсці ангорскіх трусоў. Такая пража вельмі дарагая каштуе і ў нас — дэфіцыт. Але, каб працаваць з такога матэрыялу, не патрэбная папярэдняя апрацоўка, у адрозненне ад прадзення з воўны ці з шэрсці сабак. Я так захацела завесці ангорскіх трусоў, што мужу не давала спакою.

СТАР. 3

Надзённае

# ЖЫЛЛЁ-2023: РОСТУ ЦЭН НЕ БУДЗЕ?

### Адзначаем самыя значныя падзеі на сталічным рынку нерухомасці летась і робім прагноз

**Колькасць здзелак куплі-продажу жылля летась у Мінску была рэкорднай. Якія тэндэнцыі намеціліся на рынку жылой нерухомасці і чаго пакупнікам і прадаўцам чакаць ад 2023-га?**



## РЭКОРДЫ ПА ЗДЗЕЛКАХ

Летась на рынку жылля ў Мінску было заключана 15,5 тысячы здзелак — гэта значны, рэкордны паказчык. У пачатку 2022 года ніхто не чакаў, што на рынку адбудуцца падзеі, якія прывядуць да новых рэкордаў: даходы насельніцтва асабліва не растуць, крэдыты істотна не таннеюць, а значыць, чакаць усплёску попыту пры адсутнасці эканамічных перадумоў сэнсу няма. Але год паказаў нам, што літаральна за пару дзён усё можа змяніцца.

СТАР. 4

ISSN 1990 — 763X
23012>

# «Мы адназначна выстаім»

## Пасяджэнне дзвюх калегій як ніколі своечасовае

Сяргей Лаўроў перадаў прывітанне Аляксандру Лукашэнку ад яго расійскага калегі Уладзіміра Пуціна. Ён адзначыў, што ў мінулым годзе прэзідэнты дзвюх краін, акрамя тэлефонных кантактаў, 10 разоў сустракаліся асабіста. «Так, што нам з ўзроўні кіраўнікоў міністэрстваў замежных спраў не дагнаць вас, але так і павінна быць», — адзначыў ён.

«Сёлета яшчэ больш будзем сустракацца», — адказаў на гэта Аляксандр Лукашэнка.

Міністр замежных спраў Расіі падкрэсліў, што пасяджэнне дзвюх калегій як ніколі своечасовае. Па яго словах, пытанні, вынесеныя на парадак дня, датычацца таго становішча, якое склалася ў выніку лініі заходніх калег на татальнае дамінаванне на чале з амерыканцамі, якія ўсіх астатніх пастроілі. «Гэта назіраецца ў пазіцыі і НАТА, і Еўрасаюза, і Савет Еўропы ўжо на гэтым шляху. Шмат праблем распальваецца ў АБСЕ. Гэта адны з галоўных пытанняў на парадку дня нароўні з супрацоўніцтвам у міжнародных арганізацыях, дзе нам важна не дапусціць прыватызацыі сакратарыятаў, гэта таксама Захад спрабуе зрабіць. І асабліва важна каардынаваць нашы дзеянні на так званым праваабарончым полі — Савет ААН па правах чалавека, іншыя механізмы, дзе Захад спрабуе палітызаваць дыскусіі, якія павінны ісці на аснове нормаў міжнароднага гуманітарнага права», — сказаў Сяргей Лаўроў. Што датычыцца спецыяльнай ваеннай аперацыі, па яго словах, расійскім бокам разам з беларускімі саюзнікамі і сябрамі прымаюцца ўсе неабходныя меры, каб засцерагчы сябе ад намераў заходніх суседзяў.

«Мы бачым, як на поўначы Еўропы, якая была шмат у чым нейтральнай тэрыторыяй, зараз уладкоўваецца НАТА. Фінляндыя, Швецыя — усё гэта вельмі блізка ад нашых межаў. І цалкам з вамі згодны, што тыя дамоўленасці, якія два прэзідэнты дасягаюць у сферы нашага ваенна-тэхнічнага, ваеннага, абарончага супрацоўніцтва, вельмі своечасовыя з пункту гледжання гатоўнасці да любога развіцця падзей. Мы, як гаворыцца, людзі мірныя, але наш бронецягнік стаіць там, дзе яму належыць», — рэзюмаваў Сяргей Лаўроў.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

**У тэму**

## У нас адзіная пазіцыя

**Міністр замежных спраў Расійскай Федэрацыі Сяргей ЛАЎРОЎ** расказаў журналістам, што падчас рабочай сустрэчы Прэзідэнту Беларусі далажылі аб рабоце міністэрстваў замежных спраў дзвюх краін па правядзенні ў жыццё знешнепалітычных аспектаў умацавання Саюзнай дзяржавы. «У нас існуе практыка прыняцця двухгадовых праграм па ўзгодненых знешнепалітычных дзеяннях на міжнароднай арэне. Гэтай практыцы ўжо больш за 20 гадоў. Цяпер рэалізоўваецца праграма на 2022—2023 гады, мы рыхтуем чарговы дакумент для зацвярджэння Вышэйшым дзяржаўным саветам на наступныя два гады», — сказаў ён.

У рамках рэалізацыі гэтых сумесных дзеянняў на знешнепалітычнай арэне рэгулярна штогод праводзіцца сумеснае пасяджэнне калегій двух міністэрстваў замежных спраў. Міністр замежных спраў Расіі адзначыў, што парадак дня чарговага пасяджэння ў Мінску сканцэнтраваны на выпрацоўцы дадатковых крокаў па рэалізацыі скаардынаванай лініі адносна дзеянняў такіх структур, як НАТА, Еўрапейскі саюз, якія спрабуюць падцягваць да гэтых варожых дзеянняў супраць нашых краін, супраць Саюзнай дзяржавы і іншыя структуры, уключаючы і Савет Еўропы, і АБСЕ.

Акрамя гэтага, Прэзідэнту далажылі, як знешнепалітычныя ведамствы ўключаюцца ў работу па рэалізацыі 28 саюзных праграм. Усё ідзе па графіку, і адначасова рыхтуецца новы план дзеянняў па ўмацаванні Саюзнай дзяржавы, рэалізацыі дагавора аб Саюзнай дзяржаве на перыяд з 2024 да 2026 года.

«Вядома, мы абмяняліся меркаваннямі аб тым, як развіваецца знешняя сітуацыя вакол падзей ва Украіне ў рамках правядзення спецыяльнай ваеннай аперацыі. У нас тут адзіная пазіцыя ў тым, якіх мэт трэба дасягаць і як трэба дабівацца таго, каб ні ў дачыненні да Расіі, ні ў дачыненні да Беларусі ад нашых суседзяў, ці ад Украіны, ці ад некага яшчэ не сыходзілі пагрозы. Усё, што неабходна рабіць па прамым даручэнні двух прэзідэнтаў, рэалізуецца. У мінулым годзе прэзідэнты нашых краін сустракаліся 10 разоў. Гэта падкрэслівае асаблівы характар адносін у рамках Саюзнай дзяржавы, асаблівую ролю, якую нашы прэзідэнты адыгрываюць у прасоўванні законных інтарэсаў нашых краін і Саюзнай дзяржавы ў цэлым на міжнароднай арэне», — канстатаваў Сяргей Лаўроў.

# «Патрабаванні да кіраўнікоў будуць узрастаць»

**Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Ігар СЕРГЕЕНКА ўзяў удзел у выязным семінары-практыкуме для кіраўнікоў гар- і райвыканкамаў Магілёўскай вобласці, які прайшоў у Чавускім раёне.**



Фота БелТА.

Тэмы шасцідзённага семінара, які завершыўся 20 студзеня, былі розныя: эфектыўнасць сістэмы дзяржкіравання ў сучасных умовах і роля кіраўнікоў мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў і яе павышэнне, актуальныя пытанні сацыяльна-культурнай сферы, развіцця жыллёва-камунальнай і будаўнічай галіны, эканоміка, аграпрамысловы комплекс, асноўныя задачы фарміравання і прымянення тэрытарыяльнай абароны. У якасці спікераў перад актывам вобласці выступалі ў розныя дні Старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Наталля Качанава, старшыня Цэнтральнай выбарчай камісіі Ігар Карпенка, старшыня Беларускага грамадства «Веды» Вадзім Гігін, начальнікі камітэтаў і ўпраўленняў аблвыканкама, вучоныя.

— Вельмі важна праводзіць такія мерапрыемствы, — адзначыў у размове з журналістамі кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Ігар Сергеенка. — У Магілёўскай вобласці традыцыйна праводзіцца семінар у пачатку года, ставяцца задачы, даецца адзнака. У працэсе даводзіцца інфармацыя аб навацыях у заканадаўстве, кадравай, інфармацыйнай рабоце, сацыяльнай сферы. І крытыка таксама гучыць. Яна патрэбная, бо патрабаванні сёння высокія. Работу ўлады ацэньваюць людзі.

Размову з кіраўнікамі раёнаў Ігар Сергеенка пачаў са знешнепалітычнай абстаноўкі, бо яна сёння як ніколі складаная.

— Па ўсім перыметры нашай краіны назіраецца нарошчванне ваеннай сілы, — падкрэсліў ён. — Захад спрабуе дамінаваць. Такой напружанасці не было нават у час халоднай вайны ў 60-я гады. Складана прадказаць на дзесяцігоддзе, як будзе развівацца абстаноўка. Відавочных прыкмет агрэсіі мы не бачым, але за апошнія пяць гадоў ваенны кантынгент каля нашай граніцы павялічыўся ў тры разы.

Ігар Сергеенка звярнуў увагу на тое, што апошнім часам робіцца шмат розных правакацый. І ва ўмовах надыходзячай электаральнай кампаніі гэтыя правакацыі будуць актывізавацца. «Таму трэба ўмець адрозніваць фэйкі ад рэальных дзеянняў, — адзначыў ён. — Але сумеснымі намаганнямі мы справімся, працуючы на апярэджанне».

Не зніжаецца і эканамічны ціск. Кіраўніцтвам краіны прымаюцца беспрэцэдэнтныя меры, каб яму супрацьстаяць. Штабам антыкрызісных мер прынята каля 400 рашэнняў, якія маюць практычную сілу закона. Намаганні сканцэнтраваны на пяці найбольш значных кірунках: падтрымка экспарцёраў, імпартазамяшчэнне, абарона ўнутранага рынку, спрашчэнне ўмоў вядзення бізнесу, сацыяльная абарона насельніцтва.

— На прыкладзе Магілёўскай вобласці відаць, што ўсе пытанні, якія датычацца сацыяльнай абароны насельніцтва, вырашаюцца, — падкрэсліў кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта.

Ён таксама звярнуў увагу, што задача для рэгіёна такая ж, як і для ўсёй краіны: рэалізацыя ў раёнах мінімум аднаго новага вытворчага інвестпраекта з запатрабаванай прадукцыяй,стымуляванне мясцовых ініцыятыў, садзейнічанне развіццю малога і сярэдняга прадпрымальніцтва; стварэнне ўмоў для камфортнага жыцця людзей і новых працоўных месцаў.

Асобная ўвага — кадравым пытанням, у тым ліку замацаванню на месцах маладых спецыялістаў і недапушчэнне залішняй працоўнай міграцыі. У пытаннях падбору кадраў важныя не толькі іх кампетэнтнасць і досвед, але і маральны аспект.

Перад рэгіёнамі стаіць задача стварэння новых працоўных месцаў. Спікер звярнуў увагу і на неабходнасць амаладжэння кадраў.

— Трэба ўважліва падбіраць кадры ўсіх узроўняў, — падкрэсліў ён. — І патрабаванні да кіраўнікоў будуць узрастаць.

Асабліва актуальная тэма выхавання падрастаючага пакалення, падрыхтоўка ідэалагічнага актыву.

— Гэты год аб'яўлены Годам міру і стварэння, — падкрэсліў у канцы сустрэчы Ігар Сергеенка. — Ключавыя задачы вызначаны, год павінен быць напоўнены канкрэтнымі справамі.

— У раёнах — сіла дзяржавы, таму важна праводзіць такія мерапрыемствы, — падвёў вынікі сустрэчы Ігар Сергеенка. — Сёння адбыўся жывы абмен думкамі, у тым ліку і па іншых пытаннях. Гэта таксама добрая магчымасць непасрэдна самім кіраўнікам паразмаўляць паміж сабой, абмяняцца вопытам, узяць на ўзбраенне найлепшыя прыклады. Гучала і крытыка, бо сёння кадрам прад'яўляюцца высокія патрабаванні. У тым ліку важна, як вядзецца работа са зваротамі грамадзян, якія іх цікавяць пытанні. Улада павінна сумленна і адкрыта вырашаць праблемы людзей, знаходзіць для гэтага варыянты, бо менавіта ўлада служыць народу і працуе для яго.

***

У гэты ж дзень Ігар Сергеенка ўзяў удзел ва ўрачыстасцях, прысвечаных 85-годдзю Магілёўскай вобласці. У сваім звароце да жыхароў Прыдняпроўскага краю ён падкрэсліў, што на Магілёўшчыне жывуць таленавітыя і працавітыя людзі. Ігар Сергеенка зачытаў прывітальны адрас ад Прэзідэнта і ўручыў ганаровыя граматы і падзякі ад Адміністрацыі Прэзідэнта. Віншавальныя словы прагучалі таксама з вуснаў губернатара вобласці Анатоля Ісачанкі. 15 найлепшым прадстаўнікам у розных сферах ён уручыў спецыяльную прэмію аблвыканкама «Чалавек года».

Ва ўрачыстасцях удзельнічалі першы намеснік міністра інфармацыі Андрэй Кунцэвіч і намеснік міністра прамысловасці Дзмітрый Харытончык.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Брытанцы не вераць абяцанням свайго прэм'ера па паляпшэнні жыцця ў краіне



Прэм'ер-міністр Вялікабрытаніі Рышы Сунак не здолее выканаць абяцанні па паляпшэнні жыцця ў краіне. Паводле даследавання, якое праводзіцца мясцовай сацыялагічнай службай, так лічыць большая частка апытаных брытанцаў, паведаміла РІА «Навіны». Як вядома, у пачатку студзеня прэм'ер-міністр Вялікабрытаніі даў пяць абяцанняў на 2023 год, накіраваных на паляпшэнне ўзроўню жыцця ў краіне. У намеры Сунака ўваходзіць паляпшэнне сістэмы аховы здароўя, паніжэнне дзяржаўнага доўгу, барацьба з нелегальнымі мігрантамі, развіццё эканомікі, а таксама скарачэнне інфляцыі. Аднак толькі 27 % брытанцаў лічаць, што ўраду Сунака ўдасца выканаць план па развіцці эканомікі і зніжэнні дзярждоўгу. Колькасць апытаных, якія ўпэўнены ў поспеху дзеянняў па спыненні патоку мігрантаў, — 24 працэнты. Крыху менш брытанцаў вераць у зніжэнне інфляцыі ўдвая — 23 %. І толькі 19 % апытаных брытанцаў вераць у планы ўрада па паляпшэнні медыцыны і зніжэнні колькасці пацыентаў у лістах чакання.

## Прэм'ер-міністр Новай Зеландыі вырашыла пайсці ў адстаўку

Джасінда Ардэрн аб'я-віла, што сыдзе з пасады прэм'ер-міністра Новай Зеландыі ў наступным месяцы, прызнаўшыся ў сваім выступленні, што ў яе больш няма сіл працаваць на гэтай пасадзе. 42-гадовая Ардэрн сказала, што амаль шэсць цяжкіх гадоў на месцы прэм'ера моцна яе выматалі. «Вы не можаце і не павінны выконваць гэтую працу, калі ў вас няма поўнага бака, плюс няшмат у запасе для тых незапланаваных і нечаканых задач, якія непазбежна ўзнікаюць. Паразважаўшы над гэтым летам, я ведаю, што ў мяне больш няма таго лішняга ў баку, каб выконваць працу належным чынам», — цытуюць яе заяву мясцовыя СМІ. Джасінда Ардэрн стала самай маладой жанчынай-кіраўніком урада ў свеце, калі ў 2017 годзе, ва ўзросце 37 гадоў, яна была абраная прэм'ер-міністрам. Як паведамляе Bloomberg, Лейбарысцкая партыя прагаласуе за новага лідара 22 студзеня. Пераможцу спатрэбіцца набраць не менш чым дзве трэці галасоў. Па словах Ардэрн, чакаецца, што працэс завершыцца не пазней за 7 лютага. Яна таксама аб'явіла, што ўсеагульныя выбары ў краіне адбудуцца 14 кастрычніка.

## У суседнія краіны прыбыло каля васьмі мільёнаў бежанцаў з Украіны

Упраўленне вярхоўнага камісара ААН па справах бежанцаў (УВКБ) паведаміла, што з пачатку спецыяльнай ваеннай аперацыі РФ у краіны Еўропы прыбыло больш як 7,97 мільёна бежанцаў з Украіны, перадало ТАСС. Толькі за апошні тыдзень іх колькасць узрасла на 10,5 тысячы чалавек. Як адзначаюць ва Упраўленні, больш за ўсё бежанцаў прыняла Расія — звыш 2,85 мільёна чалавек. Далей ідуць Польшча (1,56 мільёна), Германія (звыш мільёна), Чэхія (482 тысячы), Італія (167 тысяч), Іспанія (161 тысяча), Вялікабрытанія (155 тысяч), Балгарыя (150 тысяч), Францыя (каля 119 тысяч), Славакія (107,4 тысячы), Румынія (107,2 тысячы) і Малдавія (102 тысячы). У астатніх дзяржавах гэтая колькасць не перавышае 100 тысяч чалавек. У нацыянальныя праграмы часовай абароны і падтрымкі ўключана каля 5 мільёнаў бежанцаў. Паводле даных УВКБ, у цэлым у суседнія краіны прыбыло 17,68 мільёна чалавек. Пры гэтым 9,58 мільёна перасекла граніцу ў зваротным напрамку.

# ЦЕПЛЫНЯ... ЯНА ПРАДАЕЦЦА



*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Яшчэ была цяжарная, і ён мудра не адмаўляў, але прасіў пачакаць. Калі сын нарадзіўся — стала не да трусінай гаспадаркі. Але мары вырабляць пражу і вязаць з яе не здрадзіла.

## Ёсць бізнес-план!

Пасля водпуску па доглядзе дзіцяці жанчына ўладкавалася да індывідуальнага прадпрымальніка ў сваім пасёлку майстрам па рамонце адзення.

— Справа ішла не надта бойка, нашы жыхары не часта звяртаюцца па такую паслугу. Таму зарабіць складана. Вырашыла працаваць як самазанятая, — тлумачыць жанчына.

Мінулай вясной Ганна стала на ўлік беспрацоўных і пачала афармляць рамесную дзейнасць. Ёй ва ўпраўленні па працы, занятасці і сацыяльнай абароне прапанавалі прайсці навучанне па прадпрымальніцкай дзейнасці і скласці бізнес-план. Майстрыха нечакана для суседзяў па пасёлку вырашыла больш не займацца пашывам і рамонтам адзення, а зарэгістравацца як вытворца тканых і вязаных адзення і аксесуараў. Калі прайшла курсы і абараніла бізнес-план, атрымала субсідыю на развіццё ўласнай справы.

— Ткацтва як рамесная дзейнасць — з'ява ў нас рэдкая. Раней на адпаведных выставах і кірмашах ніколі не сустракала рамеснікаў-ткачоў. Большасць знаёмых круцілі пальцам ля скроні, — прызнаецца Ганна. — У бізнес-плане прапісала, колькі за месяц магу зрабіць, каб атрымаць даход, прапісала выдаткі, абазначыла, як мяркую распаўсюджваць сваю прадукцыю, запланавала супрацоўніцтва з фермерамі, якія займаюцца развядзеннем жывёл, каб набываць у іх воўну.

За сродкі дзяржаўнай субсідыі — а яна атрымалася ў памеры чатырох тысяч шасцісот рублёў — Ганна набыла ткацкія станкі: вялікі стацыянарны і мабільны для кірмашоў і выязных майстар-класаў, неабходныя для іх матэрыялы. Спачатку майстрыха ткала дыванкі з другаснай сыравіны — у справу пайшла старая пасцельная бялізна і вельмі прыгодныя для такіх вырабаў зношаныя джынсы. Ткала яна і палатно, рабіла дэкаратыўныя падушкі, сумкі-шоперы. З воўны і сабачай шэрсці вырабляла паланціны, шалікі, пальчаткі. Так атрымалася вязана-тканая «капсула», як цяпер модна абазначаюць кампаненты гардэробу, якія пасуюць адзін да аднаго.

## Ніводны сабака не пацярпеў

— Мне хочацца, каб людзі бачылі, што такі матэрыял, як сабачая шэрсць, — гэта не толькі пра вязанне шкарпэтак і супрацьрадыкулітных пасяў, пры ўсёй павазе і да гэтых вельмі важных вырабаў, — пераконвае Ганна Фрошына. Цёплыя рэчы могуць быць утульнымі, эстэтычнымі і далікатнымі. У тканых рэчах Ганне падабаецца гэты пяшчотны, мяккі акцэнт пастэльнага каляровага настрою.

— Аказалася, што працаваць з воўнай вельмі складана. Цяпер у асноўным вырабляю пражу з сабачай шэрсці. Прыстаю да сабачнікаў на вуліцы, — смяецца Ганна.

Самаед, чау-чау, аўчарка — вычасаная шэрсць прадстаўнікоў гэтых парод самая лепшая для вырабаў, тлумачыць майстрыха. Яна яе мые, чэша, прадзе, а толькі пасля вяжа або тчэ.

## Вытрымаць выклік публічнасці

Майстрыха прызнаецца, што самым складаным для яе ў справе самазанятай стала рэклама. Акрамя таго, кажа, яе ўнутраны творца — мастак, часам моцна пакутуе, калі пры вырабе на заказ жаданне кліента супярэчыць яе густу.

— Курсы прадпрымальніцкай дзейнасці, якія дзяржава арганізуе абсалютна бясплатна для беспрацоўных, вельмі карысныя для чалавека, у якога ёсць жаданне адкрыць сваю справу. Навучанне дае патрэбны напрамак: з чаго пачынаць, як скласці бізнес-план, як развівацца далей, — мяркуе Ганна. — Для мяне, напрыклад, стала самым складаным прасоўваць сваю прадукцыю анлайн, праз сацыяльныя сеткі. Калі чалавек не надта камунікабельны, як я, гэта сапраўды работа над сабой, яна вельмі важная, трэба рыхтавацца да яе. Калі б была магчымасць яшчэ і такія курсы праходзіць перад тым, як адкрываць бізнес ці афармляць рамесніцтва, было б цудоўна.

Майстрыха зазначае, што самазаняты ці індывідуальны прадпрымальнік, які рыхтуецца адкрыць сваю справу і разлічвае атрымаць дзяржаўную падтрымку, можа пэўныя сродкі на рэкламу сваёй прадукцыі закласці ў бізнес-план. Ганна так не зрабіла. Пабаялася, што не зможа асвоіць сродкі, закладзеныя на рэкламаванне, а справаздача па кожным артыкуле строгая.

— Як ткачыха я самавучка. У мяне чатырохрамізны станок і ўсё, што магла самастойна, я асвоіла. Цяпер зразумела, што інфармацыі, якая ёсць у адкрытым доступе, недастаткова. Простае палатнянае перапляценне мне ўжо ткаць не цікава: таму хачу анлайн навучацца шматрамізнаму ткацтву ў клубе ткачоў з Санкт-Пецярбурга. Мару асвоіць саржавае, атласнае перапляценне нітак палатна з самай разнастайнай фактурай, — падзялілася планамі яна.

## ❍ У тэму

За кожную падобную гісторыю развіцця ўласнай справы, арганізацыі самазанятасці ў Гомельскім раёне шчыра перажывае, падтрымлівае людзей **начальнік упраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Гомельскага райвыканкама Наталля ПАНІНА.** Спецыяліст звяртае ўвагу, што да іх ва ўпраўленне ў любы час па бясплатнае перанавучанне на запатрабаваныя на рынку працы спецыяльнасці могуць звяртацца жыхары раёна. Дапамогуць у пошуку работы і беспрацоўным жыхарам абласнога цэнтра. Звярнуцца па субсідыю на развіццё індывідуальнага прадпрымальніцтва і рамесніцкай дзейнасці ў Гомельскім раёне могуць толькі зарэгістраваныя жыхары раёна, якія афіцыйна беспрацоўныя і не вядуць ніякай іншай працоўнай дзейнасці.

— Летась у раёне было выдадзена 10 субсідый на развіццё індывідуальнага прадпрымальніцтва і рамесніцкай дзейнасці. Сярод іх — аддзелачныя, сталярныя, цяслярскія работы, арэнда і лізінг будаўнічых машын і абсталявання, паслугі бухгалтара, цырульніка, вырошчванне ягад, арэхаў і іншых пладоў, вытворчасць гатовых тэкстыльных вырабаў, — пералічвае Наталля Паніна.

Адна з апошніх дзяржаўных дапамог была выдадзена на адкрыццё ўласнай справы па забеспячэнні фізічнага камфорту — створаны паўнавартасны SPA-цэнтр у пасёлку Краснае Гомельскага раёна. Як адзначае начальнік упраўлення, субсідыя для ўсіх, хто падае заяўку, аднолькавая. Гэта 15 бюджэтаў пражытковага мінімуму на момант выдавання субсідыі. Праз тры месяцы пасля атрымання такой формы падтрымкі яе адрасат павінен даць справаздачу, якім чынам былі асвоены сродкі. Увесь працэс пад строгім кантролем трымаюць не толькі спецыялісты ўпраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароне, але і падатковыя службы.

— Акрамя таго, мы прапануем беспрацоўным жыхарам раёна перанавучанне па тых прафесіях, якія запатрабаваныя на нашых прадпрыемствах і ў арганізацыях, — дадае Наталля Паніна. — Толькі летась накіравалі на навучанне 23 чалавекі, пры гэтым 19 з іх праходзілі навучанне па заяўках ад канкрэтных наймальнікаў і ўжо былі забяспечаны рабочымі месцамі. Часта да нас па дапамогу звяртаюцца маладыя спецыялісты, якія скончылі ўстанову са свабодным дыпломам, але з тых ці іншых прычын не знайшлі работу. Мы развіваем такі кірунак, як маладзёжная практыка. На працягу шасці месяцаў упраўленне бярэ на сябе абавязацельства аплачваць практыку маладога спецыяліста на прадпрыемстве ці ў арганізацыі. Маладыя спецыяліст, калі добра зарэкамендаваў сябе, пасля практыкі застаецца там працаваць.

Звяртаюцца па дапамогу і грамадзяне з дадатковымі гарантыямі — шматдзетныя бацькі, людзі з інваліднасцю, тыя, хто вызваліўся з месцаў пазбаўлення волі.

— Мы працаўладкоўваем усіх. У раёне на сёння больш як 700 вакансій, з іх звыш 500 — па рабочых прафесіях. Падчас пошуку ўлічваем абгрунтаваныя пажаданні людзей аб месцы працаўладкавання, бо раён вельмі вялікі па плошчы і транспартная даступнасць — значны крытэрый, які таксама ўлічваецца, — падкрэслівае начальнік упраўлення.

На тэрыторыі сельсаветаў абавязкова штомесячна праводзяцца кірмашы вакансій. У іх арганізацыі значную дапамогу аказваюць старшыні сельвыканкамаў, бо яны заўсёды ведаюць дакладна, хто мае патрэбу ў працаўладкаванні. Перад правядзеннем сустрэч запрашэнні адрасна дасылаюцца ўсім беспрацоўным грамадзянам.

— Мы звяртаем увагу нашых жыхароў і на тое, што няма ніякай патрэбы, калі ты беспрацоўны, накіроўвацца на невядомыя заробкі ў замежныя рэгіёны, бо тут, дома, ёсць магчымасць уладкавацца на дзяржаўныя прадпрыемствы і арганізацыі, дзе працоўныя правы і інтарэсы работнікаў заўсёды абароненыя, дзе ёсць стабільны заробак і ўсе неабходныя сацыяльныя гарантыі, — падкрэслівае Наталля Паніна. — Знайсці работу можна не толькі па месцы жыхарства, але і на тэрыторыі любога рэгіёна нашай краіны. Калі ёсць жаданне, нічога не перашкодзіць атрымліваць належную заробатную плату. Адзін з нядаўніх прыкладаў: па праграме перасялення жыхар самага аддаленага сельсавета нашага раёна змог працаўладкавацца ў Мінскім раёне. Як вопытны спецыяліст ён шукаў работу на гарбарнай вытворчасці, у нас такой не было.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА, фота аўтара.**

Блізкая ўлада

# Выканкамы на сувязі

**Практыка правядзення прамых ліній рэгіянальнай «вертыкаллю» працягваецца. Калі ў вас ёсць пытанні або праблемы, якія патрабуюць умяшання органаў улады, тэлефануйце.**

Тэлефонныя лініі ў суботу, 21 студзеня, з 9.00 да 12.00 правядуць:

• першы намеснік старшыні Брэсцкага аблвыканкама Валянцін Міхайлавіч ЗАЙЧУК. Тэл. 8 016 226 99 26;

• намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама Анжаліка Аляксандраўна НІКІЦІНА. Тэл. 8 021 222 22 22;

• першы намеснік старшыні Гомельскага аблвыканкама Дзмітрый Іванавіч КОЗЕЛ. Тэл. 8 023 233 12 37;

• старшыня Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў Алена Васілеўна ПАСЮТА. Тэл. 8 015 273 56 44;

• першы намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Сяргей Канстанцінавіч САВІЦКІ. Тэл. 8 022 250 18 69;

• кіраўнік спраў Мінскага аблвыканкама Таццяна Мікалаеўна ШАЎЦОВА. Тэл. 8 017 500 41 60;

• намеснік старшыні Мінскага гарвыканкама Арцём Мікалаевіч ЦУРАН. Тэл. 8 017 222 44 44.

Надвор'е

# ТО МОЦНЫ СНЕГ, ТО ДОЖДЖ І ГАЛАЛЁДЗІЦА...

### Але на наступным тыдні пры праясненнях да 11 марозу

**У нашай краіне ўжо больш за тыдзень адзначаецца не па сезоне цёплае надвор'е, якое прынеслі паветраныя масы з паўднёвага захаду Еўропы. Але ў найбліжэйшы час у нас зноў будзе ісці снег, мокры снег і дождж, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

Ужо ў суботу актыўная франтальная сістэма, якая ссоўваецца з тэрыторыі Украіны, абумовіць ноччу і раніцай на большай частцы тэрыторыі краіны снег, мокры снег і дождж. Месцамі па паўднёвым захадзе краіны прагназуецца моцны снег, які будзе суправаджацца ўзмацненнем ветру да моцнага парывістага, у асобных раёнах — з завеяй. Удзень — месцамі па краіне ападкі ў выглядзе снегу, мокрага снегу і дажджу. У асобных раёнах чакаецца наліпанне мокрага снегу, слабы галалёд, на дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 3 градусаў да плюс 2, а днём — мінус 1 — плюс 4 градусы.

Надвор'е крыху супакоіцца ў нядзелю. У гэты дзень франтальныя раздзелы пакінуць тэрыторыю Беларусі, і кароткачасовыя ападкі чакаюцца толькі месцамі. У асобных раёнах слабыя туман і галалёд, на дарогах галалёдзіца. Уначы тэмпература паветра будзе ад мінус 4 да плюс 1 градуса, удзень — ад мінус 1 градуса да 4 цяпла.

У панядзелак чакаецца пераважна без ападкаў, толькі ўначы і раніцай месцамі па захадзе краіны магчымыя невялікія ападкі (мокры снег, дождж). У асобных раёнах слабыя туман і галалёд, на дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы — ад мінус 4 да плюс 2 градусаў, па паўночным усходзе пры праясненнях да 5—8 марозу. Днём будзе мінус 2 — плюс 4 градусы.

Зіма пачне вяртацца да нас у аўторак і сераду. У гэтыя два дні прагназуецца пераважна без ападкаў. Ноччу месцамі слабыя туман і галалёд. На асобных участках дарог галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе ад нуля да мінус 7 градусаў, па ўсходзе пры праясненнях 8—11 градусаў ніжэй за нуль. Удзень будзе ад мінус 4 градусаў да 3 цяпла.

## Выйшла вада на пойму

У найбліжэйшы час у краіне захаваецца складаная гідраметэаралагічная абстаноўка, перадаюць спецыялісты.

Айчынныя гідролагі інфармуюць, што на Бярэзіне — у раёне Светлагорска, а таксама яе прытока, ракі Сушанка, каля вёскі Суша вада выйшла на пойму. Пачаўся крыгалом на Дняпры ў раёне гарадскога пасёлка Лоеў. Вызваліліся ад ледзяных утварэнняў Дняпро ў раёне Оршы, Прыпяць — у раёне Петрыкава, а таксама некаторыя іх прытокі і асобныя прытокі Заходняй Дзвіны, Віліі і Бярэзіны.

Цяпер на ўсім працягу Бярэзіны, Сожа, на Заходняй Дзвіне каля гарадскога пасёлка Сураж і аграгарадка Ула, Дняпры на ўчастку Магілёў—Жлобін, асобных іх прытоках, а таксама Прыпяці ў Нароўлі, назіраецца няпоўны ледастаў і ледастаў з палонкамі. Акрамя таго, там павялічыліся прасторы з адкрытай воднай паверхняй, лёд пацямнеў і растае на месцы, назіраецца вада на лёдзе.

Спецыялісты ўпэўнены, што ў найбліжэйшыя дні складаная гідраметэаралагічная абстаноўка захаваецца.

**Сяргей КУРКАЧ.**

**Члены Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь і работнікі Сакратарыята Савета Рэспублікі выказваюць глыбокія спачуванні Вользе Генадзеўне Нікіценцы, намесніку начальніка аддзела па забеспячэнні дзейнасці Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве, у сувязі з напаткаўшым яе вялікім горам — смерцю БАЦЬКІ.**

# ЖЫЛЛЁ-2023: РОСТУ ЦЭН НЕ БУДЗЕ?



*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

На другасным рынку ўзнікла вялікая прапанова і такі ж попыт. Пакупнікоў больш не стала: наадварот, іх стала менш. Проста амаль усе яны разгарнуліся ў бок рынку другаснага жылля: падзеі лютага—сакавіка мінулага года прымусілі думаць, што ўкладваць грошы ў новабудоўлі даволі рызыкоўна. Людзі сумняваюцца: грошы аддаеш цяпер, а дом будзе гатовы праз год-паўтара... А ці ўсё пойдзе па плане? Ці дабудуюць дом?

Аб'ёмы прапановы цяпер прыкладна ўраўнаважылі: кватэр на другасным і першасным рынках прадаецца прыкладна аднолькавая колькасць. У 2021 годзе, кажуць эксперты, продажаў на першасным рынку было больш.

Па сутнасці, мы атрымалі новы рэкорд другаснага рынку за кошт тых пакупнікоў, якія былі да гэтага ўпэўнены ў неабходнасці куплі новабудоўлі, але потым вырашылі не рызыкаваць і звярнулі ўвагу на гатовае жыллё.

У канцы года цана квадратнага метра ў рэальных здзелках павялічылася літаральна на 1-2 %. Але гэта, тлумачаць эксперты, не значыць, што «квадрат» сапраўды даражэе. Кватэра, якая раней каштавала ўмоўна 48 тысяч долараў, так і каштуе 48 тысяч. Змянілася структура здзелак: у іх стала менш танных кватэр. Людзі — асабліва гэта датычыцца тых, хто першапачаткова хацеў новабудоўлю, — усё часцей выбіраюць акуратныя кватэры ў адносна «свежых» дамах, а яны ў прынцыпе каштуюць даражэй, вось і сярэдняя цана метра расце.

Таму, кажа эксперт, думаць, што цэны на рынку растуць і прадаць сваю кватэру ў хуткім часе атрымаецца даражэй, у цяперашніх абставінах неразумна.

Калі ў нас апошні раз раслі цэны на другасным рынку — у перыяд з 2017 да 2020 года, — гэта тлумачылася сукупнасцю аб'ектыўных эканамічных і псіхалагічных фактараў: пазітыўнае развіццё эканомікі, стабільная знешнепалітычная і знешнеэканамічная сітуацыя, рост даходаў насельніцтва, стабільны долар і цэны на прадукты харчавання.

## КРЫХУ АБ СНЕЖНІ

Сталічны рынак кватэр скончыў год ростам продажаў — у снежні, па падліках спецыялістаў, купілі больш за 1630 кватэр, што на 7 % вышэй значэння папярэдняга месяца. Бягучы ўзровень попыту для снежня саступае толькі 2021 году, калі было заключана 1655 здзелак. Што яшчэ адбылося на рынку нерухомасці Мінска ў апошні месяц 2022 года?

З прычыны пачатку святочнага перыяду колькасць аб'яў у базе партала Realt.by, наадварот, паказала адмоўную дынаміку. За месяц колькасць аб'яў аб продажы кватэр у Мінску зменшылася на 7,5 %.

Структура попыту па колькасці пакояў у снежні ў параўнанні з лістападам крыху змянілася: доля ўсіх здзелак, якая прыпадае на аднапакаёвыя кватэры, знізілася да 43 %, у той час як доля двухпакаёвых кватэр, наадварот, павялічылася да 35 %. Як і ў лістападзе, на трохпакаёвыя кватэры прыходзілася толькі 18 % усіх здзелак.

Часцей куплялі кватэры ў новых гатовых дамах — у 11 % выпадкаў, што на 3 % больш, чым у лістападзе. Нягледзячы на гэта, попыт усё роўна працягвае заставацца ніжэйшым за сярэдні: звычайна іх доля ў рамках месяца складае 12-13 %.

Сярод раёнаў часцей за іншыя выбіралі Кастрычніцкі, Ленінскі і Першамайскі, радзей — Фрунзенскі і Маскоўскі. Менш, чым у іншыя месяцы, пакупнікі цікавіліся кватэрамі ў сучасных каркасных дамах. Часцей выбіралі тыпавыя і старыя панэльныя дамы.

Канец года адзначыўся невялікім ростам цэн: сярэдняя цана прададзеных кватэр у Мінску за снежань вырасла на 0,8 % і склала 1318 долараў за квадратны метр. Усё ж аднапакаёвыя кватэры і ў снежні паказалі адмоўную дынаміку, калі цэны за месяц знізіліся на 1 % і сталі 1394 долары за квадратны метр. У сярэднім аднапакаёвая кватэра прадавалася ў апошнія дні года за 50 тысяч долараў. А вось двухпакаёвыя кватэры злёгку падаражэлі (плюс 3 %) — да 1289 долараў за «квадрат». За кватэру — 58 550 долараў. Нязначна падаражэлі і трохпакаёвыя кватэры (плюс 1,6 %) — да 1186 долараў за квадратны метр. Сярэдняя цана такой кватэры — 73 500 долараў.

Сярэдняя цана прапановы кватэр за снежань таксама паказала станоўчую дынаміку. У параўнанні з папярэднім месяцам яна вырасла на 3,7 % і склала 1191 долар. Гэтая цана прапановы моцна схільная да ўплыву аб'яў аб продажы кватэр у асобных новабудоўлях (не ўсяго першаснага рынку). Былі зроблены разлікі, згодна з якімі без уліку новабудоўляў сярэдняя цана прапановы квадратнага метра ў снежні складала 1370 долараў (+2,7 % за месяц).

У большасці ключавых гарадоў рэгіёна сярэднія цэны квадратнага метра ў доларавым эквіваленце за месяц паказалі рост у раёне 4 %. Выключэннем сталі Санкт-Пецярбург і Масква, дзе ў параўнанні з лістападам кватэры сталі таннейшымі на 7 % і 6,4 % адпаведна.

Калі браць дыяпазон у 12 месяцаў, то за год жыллё ў Мінску патаннела амаль на 3 %. Мацней за ўсё патаннелі кватэры ў Кіеве — амаль на 30 % (1475 долараў за квадратны метр). Жыллё ў Маскве падаражэла на 18 % (3895 долараў за «квадрат»), а ў Варшаве яно стала таннейшым на 4,6 % (3071 долар).

## А ШТО Ў 2023-м?

— Ад чаго залежыць рынак нерухомасці, цэны і пакупніцкая актыўнасць насельніцтва? Рэальныя даходы ў валютным эквіваленце, даступнасць крэдытаў, прапанова кватэр, чаканні і настрої, — пералічвае **незалежны эксперт па нерухомасці Наталля ЛІТОЎСКАЯ.** — Апошні фактар працаваў у мінулым годзе так, як не працаваў ніколі. У «роўныя гады» кватэры больш актыўна купляліся на хвалі аптымізму. У гэтым годзе — на хвалі песімізму (трэба кудысьці ўкласці ўсё назапашанае, калі ўжо банкі падкінулі такі сюрпрыз — выдавалі ўклады дробнымі порцыямі).

Купля кватэры, нават пад здачу ў арэнду, — неідэальны спосаб захавання сродкаў. Да канца восені мінчане, якія жадалі купіць метры, зрабілі гэта. Але на рынак выйшлі людзі з рэгіёнаў. Хтосьці ў Мінск пераязджае, хтосьці тут гэтак жа купляе «пра запас».

Чакаецца, што ў першай палове года будзе яшчэ назірацца міграцыя валютных назапашванняў з рэгіёнаў у сталічныя і прысталічныя метры. Прапанова на рынку больш чым шырокая, ёсць з чаго выбіраць. І дэфіцыту новабудоўляў у 2023-м гэтак жа не прагназуецца.

## СЦЭНАРЫІ — РОЗНЫЯ

Што будзе з цэнамі на жыллё, адгадаць складана, калі не ведаеш зыходных даных па рэальных даходах і даступнасці крэдытаў, лічыць Наталля і апісвае два сцэнарыі.

**Пазітыўны.** У ім даходы насельніцтва ў валюце «прасядаюць» неістотна, а вось крэдыты з'яўляюцца пад стаўку, якой даўно не бачылі, — пад 17 %, а то і ніжэй. Пры гэтым нас нічога не палохае — настроі грамадзян застаюцца тымі ж, што і ў 2022-м. Пры такім раскладзе ўсе, хто меў назапашанні ад 20 тысяч долараў, змогуць дакрэдытавацца і купіць сабе кватэру па бюджэце. Тыя, хто хацеў будавацца, выберуць забудоўшчыка і, зноў жа, дакрэдытуюцца.

Па вялікім рахунку, мы выйдзем на цэнавае плато. Але розныя сегменты будуць і рэагаваць па-рознаму. Напрыклад, ліквідныя метры могуць і падрасці ў кошце на 2—5 %. Неліквідныя (старое жыллё ў не самых зручных раёнах) — на тыя ж працэнты прасесці. Забудоўшчыкі будуць «мацаць» патэнцыйных дольшчыкаў. Больш папулярныя праекты па меры росту будаўнічай гатоўнасці змогуць падымаць цэны, менш папулярныя будуць прадавацца па цэнах мінулага года.

**Менш пазітыўны.** У ім рэальныя даходы адчувальна зніязцца. Банкі пакінуць стаўку па крэдытах на цяперашнім узроўні (17,56 %). Але пры гэтым (як і ў першым сцэнарыі) нас нічога не палохае — настрої грамадзян застаюцца тымі ж, што і ў 2022-м. У гэтым сцэнарыі мы яшчэ некаторы час будзем назіраць стабільнасць, але ўжо да вясны цэны пачнуць спаўзаць уніз. Без абвалаў, на лічаныя працэнты ў рэальных здзелках. У новабудоўлях тэндэнцыя будзе тая ж. Акцыі, зніжкі, да 1 мая, да 1 верасня, да Новага года...

## ІСТОТНАГА ЗНІЖЭННЯ НЕ ЧАКАЦЬ?

Аналітыкі-практыкі злёгку па-іншаму глядзяць на перспектывы развіцця рынку. Далей рынак павінен быць стабільны. Цяпер на ім дастаткова шмат актыўных пакупнікоў, у насельніцтва ёсць грошы на руках. Падобна на тое, што такім рынак і будзе заставацца ў 2023 годзе.

Вядома, гэты год не будзе такі рэкордны, як 2022-і, але і чакаць абвалу або сур'ёзнай прасадкі не варта, лічаць яны.

Цяпер ёсць магчымасць атрымаць крэдыты на нерухомасць у розных банках, «Беларусбанк» зніжае працэнтную стаўку па крэдытах, плюс з 3 студзеня з'явіўся новы крэдыт «Рэфінансаванне іпатэкі», дзякуючы якому можна перакрэдытавацца на больш выгадных умовах — усё гэта стымулюе рынак нерухомасці, па зніжаных стаўках людзі больш актыўна бяруць новыя крэдыты.

Дарэчы. Больш за 8000 чалавек скарысталася іпатэчным крэдытам «Беларусбанка» — «Іпатэка Экспрэс», які з'явіўся на рынку два гады таму. Аформіць яго можна пад заклад жылля і без паручыцельства фізічных асоб. Пры гэтым банк гатовы фінансаваць да 100 % кошту нерухомасці.

За 24 месяцы 8200 сем'яў вырашылі свае кватэрнае пытанне, аформіўшы крэдытаў на агульную суму 346 мільёнаў рублёў. За мінулы год заключана амаль 5 тысяч дагавораў на суму больш як 200 мільёнаў рублёў. Пры гэтым працэнтная стаўка крэдыту — 17,4 % гадавых.

— Паколькі 2022 год паставіў чарговы рэкорд па колькасці здзелак, гэта чарговы доказ, што попыт на жыллё ў Мінску па-ранейшаму высокі і будзе заставацца такім доўгі час, адзначыў **кіраўнік аддзела аналітыкі сталічнага агенцтва нерухомасці Андрэй ЧАРНЫШОЎ.** Мінск — цэнтр прыцягнення беларусаў з усёй краіны.

Летась пакупнікі кінулі ўсе сілы на тое, каб набыць жыллё. Спрыяла гэтаму, па-першае, аднаўленне крэдытаў на нерухомасць (імі скарысталася каля 15 % пакупнікоў на рынку другаснага жылля). Па-другое, пасля рэзкага павышэння ў лютым-сакавіку долар вярнуўся да звычайнага курса і заставаўся стабільным, а таксама нас не закранулі міжнародныя канфлікты. У 2023 год мы пераходзім, фіксуючы тры гэтыя фактары. Цэны будуць балансаваць прыблізна на адным узроўні, пра рост цэн казаць даволі складана не даводзіцца, лічыць спецыяліст.

Паводле вынікаў снежня, сярэдняя зніжка ад цаны аб'явы ў рэальных здзелках, распавядае Андрэй Чарнышоў, павялічылася з 5 % да 6 %. Здаецца, што мала? Але насамрэч у здзелках з нерухомасцю гэта вельмі сур'ёзны паказчык. Для параўнання: у 2018 годзе сярэдняя зніжка складала 3 %. Пасля сакавіка 2022 года яна была роўная нават 8 %.

Калі ж паўстане нейкі стрэс-фактар, баланс на рынку нерухомасці захавацца не зможа, і неўзабаве гэта адаб'ецца на цэнах. Калі падымецца курс долара, то неўзабаве зменяцца і цэны.

Узнікае пытанне: наколькі? Ісціне формула, якая пацвердзілася ў некалькі крызісных перыядаў. Сутнасць яе ў наступным: калі долар вырасце на 100 %, то цэны зніжаюцца толькі на 30 %. Пакупнікі часта разважаюць так: наколькі зменіцца абменны курс долара, такая зніжка нам і патрэбная. З боку абсалютнай справядлівасці, магчыма, гэта і правільна, але ёсць паняцце попыту і прапановы, а ў прадаўцоў ёсць пэўныя прывілеі, якія дазваляюць не згаджацца на такое вялікае зніжэнне.

## МІНІМАЛЬНЫЯ І МАКСІМАЛЬНЫЯ РЭКОРДЫ ГОДА

Самыя бюджэтныя сталічныя кватэры ў 2022 годзе былі досыць маленькія. Цана такога жылля вар'іруецца ад 33 900 да 34 500 долараў. У свой час гэта былі дзве кватэры за 33 900 у. а. па курсе — на вуліцах Якуба Коласа і Чыгладзэ. Абодва аб'екты былі прададзены. Цяпер самай бюджэтнай кватэрай можна лічыць яшчэ адну на Чыгладзэ, але ўжо за 34 500 долараў. На Якуба Коласа прапаноўвалася кватэра плошчай 21,2 «квадрата», пры гэтым жылы пакой займае ўсяго 11,7 метра. Кухня — 4,6 метра. З плюсоў — наяўнасць лоджыі. Была яшчэ кватэра на вуліцы Алтайскай. Яна прадавалася за 34 700 долараў па курсе. Звычайна такое жыллё прадаецца ў старых цагляных пяціпавярхоўках 1967—1969 гадоў пабудовы.

Праўда, новага ўласніка чакалі голыя сцены (падрыхтаваныя пад афарбоўку і абклейванне шпалерамі), сцяжка на падлозе, базавы набор сантэхнікі, якую, хутчэй за ўсё, яму давялося б мяняць. Міжпакаёвых дзвярэй, як правіла, таксама не бывае, затое былі ўстаноўлены шклопакеты. Увогуле, жыллю патрабаваўся грунтоўны рамонт.

У іншых варыянтах інтэр'ер бюджэтных кватэр выглядае стомлена: дзесьці адклеіліся шпалеры, дзесьці працёрся лінолеум, а сумешчаны санвузел, няма сумневаў, падлягае абнаўленню. На гэтым усё.

Мінск, вядома, — дарагі горад у плане жылля. Але некаторыя прапановы здольныя зайсці далей нават самых смелых нашых фантазій. Цэлую партыю кватэр даражэй за мільён долараў па курсе не так даўно прэзентавала сталічнае агенцтва нерухомасці. Знаходзіцца «анклаў» эліты, як і можна было здагадацца, у цэнтры горада, а менавіта ў жылым комплексе «Дэпо».

Гаворка, у прыватнасці, ідзе аб пентхаусах, размешчаных у першых дабудаваных дамах ЖК — акуратных «кубіках» на 6 паверхаў. Плошчы кватэр, безумоўна, уражваюць — каля 220 квадратных метраў. Але і цана круціцца вакол 1 200 000 долараў у эквіваленце. Гэта значыць, адзін «квадрат» прадавец ацаніў прыкладна ў 5450 долараў па курсе. І гэта за «голыя» скрынкі са сцяжкай, тынкоўкай і шпаклёўкай. Увесь астатні рамонт і абстаноўка — на плячах уласніка.

Так выглядае тыповая планіроўка дарагога пентхауса: кухня-гасцёўня плошчай ад 60 да 80 «квадратаў», да кухні прымыкае кладоўка, у якой зручна захоўваць прадуктовыя запасы, тры спальні па 16—17 метраў, кабінет, майстар-спальня пад 30 «квадратаў» з уласным санвузлом і гардэробнай. Калідоры «з'ядаюць» зусім мала месца: усяго 8 «квадратаў» з агульных 220 — уражальны вынік.

Столі больш за 3 метры, індывідуальныя вентканалы ў кожнай кватэры, унутрыпольныя канвектары, фрэонаправоды для кандыцыянераў, ліфт з паверха ў падземны паркінг... Унікальнае абсталяванне двара і пляцовак каля дома.

